# “Берагіня” для вузкага кола, або Як прапагандаваць аўтэнтыку?

За “круглым сталом” “К”: пра рэкламу фестывалю, запатрабаванасць народных танцаў ды адсутнасць турыстаў

У чэрвені бягучага года ў Акцябрскім прайшоў VIII Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня”. Пра некаторыя праблемы гэтага самабытнага фэсту наша газета пісала адразу ж пасля мерапрыемства (гл. “К” № 26 за 28 чэрвеня бягучага года). За той час, што прайшоў з моманту публікацыі, у многіх удзельнікаў форуму з’явілася шмат ідэй ды меркаванняў аб будучыні і далейшым развіцці “Берагіні”. У сувязі з гэтым у рэдакцыі "К" было вырашана зладзіць "круглы стол". Мадэратарам імпрэзы быў аглядальнік рэдакцыі газеты “Культура” Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ. У абмеркаванні фестывальных (і не толькі) праблем за “круглым сталом” “К” сабраліся галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Людміла ЛЕБЕДЗЬ, этнахарэограф, навуковы і мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня” Мікола КОЗЕНКА, старшы навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Міністэрства эканомікі краіны Алена РЫБЧЫНСКАЯ, старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ірына КАНАВАЛЬЧЫК, дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Акцябрская раённая бібліятэка” і намеснік дырэктара “Берагіні” Вера ШЧЭЦЬКА, вядучы метадыст па фальклоры Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Настасся КОМЛІК-ЯМАЦІНА.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Пачаць нашу гутарку хачу з рэкламы. І вось чаму. Пабываўшы на “Берагіні” першы раз, вельмі перажываў за слабое інфармацыйнае “гучанне” гэтага ўнікальнага для Беларусі фестывалю. На мой журналісцкі погляд, у гэтым плане арганізатарам можна было зрабіць яшчэ вельмі шмат…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Вера ШЧЭЦЬКА:**

— Як толькі “Берагіня” “прапісалася” ў Акцябрскім, мы адразу ж пачалі працаваць над рэкламай фэсту ў СМІ. І калі на пачатку існавання фестывалю нам хапала раённага друку, супрацоўніцтва з газетамі суседніх раёнаў, дык цяпер мы выходзім ужо і на рэспубліканскі ўзровень, запрашаем тэлебачанне… Але, на жаль, сустракаем пэўнае неразуменне кіраўнікамі рэдакцый газет значнасці і актуальнасці “Берагіні”. За два-тры месяцы да пачатку фестывалю ніхто не хоча друкаваць інфармацыю пра фэст, і толькі напярэдадні ў некаторых СМІ з’яўляецца сціслае паведамленне пра імпрэзу. Гэтага, натуральна, недастаткова…

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Яшчэ адзін, даволі лёгкі і дзейсны, спосаб зладзіць піяр-кампанію “Берагіні” — выкарыстоўваць для гэтага сацыяльныя сеткі. Толькі што прыехаў з “Прызба-фэсту”, дзе падобная рэклама цалкам сябе апраўдала.

**Вера ШЧЭЦЬКА:**

— На жаль, сацыяльныя сеткі мы не выкарыстоўвалі. Бо тут адразу паўстае праблема: у аддзеле культуры няма асобнага чалавека, які займаўся б усімі гэтымі пытаннямі. Мы тую ж піяр-кампанію можам ладзіць толькі спарадычна, калі з’яўляецца вольная хвіліна, бо гэта дадатковая нагрузка на супрацоўнікаў. Сёлета, напрыклад, з невялікай групай людзей зрабілі сайт фестывалю. Але гэта пакуль што ўсё, чым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

можам пахваліцца.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Адсюль, мабыць, вынікае і іншая праблема, пра якую хацеў пагутарыць: каб ладзіць "Берагіню" на належным узроўні, трэба мець асобны арганізацыйны ці каардынацыйны камітэт. Альбо нават невялікую групу валанцёраў, зацікаўленых у прапагандзе гэтага брэндавага фестывалю.

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Справа ў тым, што, хоць "Берагіня" мае статус рэспубліканскага фестывалю, усе асноўныя пытанні скінуты па вертыкалі на раённы аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. Але чаму імі не займаецца Міністэрства культуры краіны, Інстытут культуры Беларусі?

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Думаю, не памылюся, калі скажу, што існуючы Інстытут культуры Беларусі ў стане ўзяць на сябе вырашэнне некаторых агучаных пытанняў. Іншая справа, што апошнім часам там адбывалася аптымізацыя і вектары дзейнасці скіраваны на адукацыйны ды навуковы аспекты, павышэнне кваліфікацыі — усё, згодна са Статутам установы.

**Мікола КОЗЕНКА:**

— На маю думку, да таго часу, пакуль Інбелкульт будзе займацца толькі перападрыхтоўкай кадраў, адукацыйнымі пытаннямі, нічога ў гэтым плане не зменіцца. Бо Інстытут цяпер — установа адукацыі, і ў яго ёсць свае мэты ды задачы. Таму ён проста не ў стане ўзяць на сябе яшчэ і вырашэнне арганізацыйных ці каардынацыйных пытанняў фестывалю.

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— У мяне іншая думка. "Берагіня", як вядома, адрозніваецца ад усіх іншых фестываляў тым, што мае навуковую канцэпцыю, там працуе творчая лабараторыя, у склад журы ўваходзяць высокакваліфікаваныя эксперты… Таму ў гэтым аспекце Інбелкульт як установа адукацыі цалкам здольны адпрацаваць на карысць фэсту, дапамагчы яму. Шкада, праўда, што Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі аслабілі сувязь у сумеснай рабоце па падрыхтоўцы і арганізацыі фестывалю. Але гэта часова. Прыкладзём намаганні, каб падрыхтоўку да чарговай "Берагіні" мы вялі "рука ў руцэ". Акрамя таго, у перспектыве мне бачыцца, што Цэнтр беларускай культуры, пра які згадвалася ў нядаўнім нумары "К", можа паўстаць на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Там выдатныя кадры, лабараторыі і шмат чаго яшчэ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Ірына КАНАВАЛЬЧЫК:**

— Мяркую, мы вельмі засяроджваемся на нейкай установе, якая будзе вырашаць арганізацыйныя пытанні “Берагіні”. Але ж і на Беларусі, і за мяжой часцяком распаўсюджана практыка, калі ўсе падобныя праблемы “разрульваюцца” некалькімі людзьмі, зацікаўленымі ў тым, каб фестываль адбыўся. Напрыклад, нядаўна пабывала на “Прымацкай бяседзе” ў польскім Міхалове, што непадалёк ад Беластока. Там фэст ладзяць сваімі сіламі муж і жонка, а іхняя імпрэза, якая прапагандуе беларускую культуру, вядомая далёка за межамі Падляшша. Вось з каго трэба браць прыклад! А не наракаць на адсутнасць загадаў ці распараджэнняў “зверху”…

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Цалкам падтрымліваю гэтую думку. Сам бываў у Міхалове неаднойчы, гутарыў з арганізатарамі, якія лёгка вырашаюць усе праблемныя пытанні самастойна, не чакаючы “паперак” з міністэрстваў і ведамстваў. А мы, атрымліваецца, так рабіць не можам?

**Ірына КАНАВАЛЬЧЫК:**

— І яшчэ. Варта думаць пра новыя формы, пра тое, як прывабіць на фестываль турыстаў, каб яны захацелі прыязджаць у Акцябрскі кожны год, — вось самае галоўнае. Бо ў мяне склалася ўражанне, што “Берагіня” сёлета прайшла для вельмі вузкага кола. Фестываль дзеля фестывалю — ад такога прынцыпу варта адмаўляцца. Падобныя імпрэзы заўсёды трэба ладзіць з аглядкай на турыстаў, прычым як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

айчынных, так і замежных.

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Хацела сказаць пра тое ж самае. Варта абавязкова рабіць акцэнт на відовішчнасць “Берагіні”, хаця б у адзін з фестывальных дзён. Тады і з’явіцца прывабная “карцінка” фэсту, дзеля якой туды паедуць і журналісты, і тэлебачанне. А за імі — і турысты. Іншая справа — якім чынам гэта зрабіць, якім чынам стварыць з “Берагіні” Падзею… Мабыць, калі ўжо браць пад увагу відовішчнасць, варта было б скараціць конкурсную праграму, пакінуўшы там толькі паўфіналы ды фіналы.

**Ірына КАНАВАЛЬЧЫК:**

— Напрыклад, у тым жа Міхалове я неаднаразова бачыла, як да месца, дзе ладзіўся фестываль, пад’язджалі турыстычныя аўтобусы. Як распавялі мне арганізатары, яны загадзя праінфармавалі турфірмы пра сваю імпрэзу, пра тое, дзе і колькі чалавек яны могуць рассяліць… У Акцябрскім падобнага не было і блізка.

**Вера ШЧЭЦЬКА:**

— На жаль, турфірмы, да якіх мы звярталіся, так і не змаглі арганізаваць прыезд арганізаваных груп людзей на свята. Магчыма, на нас папросту забыліся. А вось калі б Міністэрства культуры звярнулася да Міністэрства спорту і турызму Беларусі, каб уключыць наш фестываль у нейкі свой пералік, дык вынік, мяркую, мог бы атрымацца зусім іншы.

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Літаральна днямі мы размаўлялі пра гэтую праблему з намеснікам дырэктара Дэпартамента па турызме названага Міністэрства Святланай Гаўрылавай. Магу з упэўненасцю сказаць, што ў Дэпартаменце ёсць разуменне значнасці падобных фестываляў для развіцця турыстычнага рынку Беларусі. Таму, мяркую, перашкод для супрацоўніцтва з Міністэрствам спорту і турызму ў нас не будзе ніякіх. Тым больш, ва ўсім свеце зараз робіцца стаўка на ўнутраны турызм. Напрыклад, у Кітаі, у краінах Еўропы. Чаму б нам не пераняць іх вопыт? Тым больш, пра ўнікальнасць “Берагіні” ўжо гаварылася неаднойчы…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Як мне падаецца, варта сказаць вось аб чым: "Берагіня" — гэта нацыянальны здабытак. І гэта трэба прызнаць на самым высокім узроўні — у Міністэрстве культуры Беларусі, у абласных упраўленнях ідэалогіі і культуры, у навучальных установах. Гэта фестываль, дзе народная харэаграфія адыгрывае вядучую ролю, таму ён унікальны для Беларусі і нават для Еўропы. Да таго ж, "Берагіня" адрозніваецца ад іншых фэстаў тым, што мае сваю выхаваўчую, прапагандысцкую ды навуковую аснову. Але пакуль не будзе абазначана прыярытэтнасць фэсту на дзяржаўным узроўні, аб ягонай "раскрутцы" казаць зарана.

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Міністэрствам культуры гэтаму фестывалю надаецца належная ўвага, нароўні з іншымі рэспубліканскімі форумамі, якія таксама вартыя падтрымкі і далейшай папулярызацыі. А ўвогуле нялішнім быў бы грамадскі савет, асацыяцыя ці нейкае іншае кола зацікаўленых асоб, — а яны сёння ёсць і ў Мінску, і ў рэгіёнах, — якія займаліся б некаторымі арганізацыйнымі пытаннямі "Берагіні". Магчыма, гэта будзе тая дзейсная структура, якая падштурхне працэс аднаўлення фэсту, працэс яго "перафармаціравання".

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— На жаль, у нас, у Беларусі, няма ці вельмі мала ёсць людзей, асабліва ў рэгіёнах, якія валодалі б методыкай арганізацыі фестываляў, няма менеджараў. А менавіта такія людзі могуць — і павінны — вызначаць рэгламент фэсту, думаць над тым, што варта прыўнесці ў арганізацыю, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад чаго трэба адмовіцца. Сёння ж атрымліваецца, што “Берагіні” — дваццаць гадоў, а развіццё фестывалю адбываецца “навобмацак”, фактычна ўсляпую, на нейкіх асабістых падыходах ды прапановах.

**Вера ШЧЭЦЬКА:**

— Згодная, сапраўды, ёсць такая праблема.

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Што да Інстытута культуры Беларусі, дык ён можа дапамагчы, на маю думку, толькі адным: сабраць людзей, якія будуць займацца фестывалем, каб яны, зыходзячы з вопыту арганізацыі падобных мерапрыемстваў, дапамаглі б Акцябрскаму райвыканкаму. Згодная з Міколам Козенкам: у статусе навучальнай установы Інбелкульт займацца арганізацыйнымі пытаннямі “Берагіні” ніколі не будзе.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— А ці магчыма падвесці нейкі фінансавы “падмурак” пад “Берагіню”, каб хоць нейкім чынам знізіць выдаткі на правядзенне фестывалю? Магчыма, за кошт тых жа турыстаў, спонсараў, мецэнатаў…

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— На мой погляд, абавязкова павінен існаваць сайт “Берагіні”, дзе б адлюстроўваліся ўсе праблемныя пытанні ў арганізацыі фестывалю, распавядалася пра мінулыя фэсты, пра тое, які бюджэт форуму і з якіх крыніц адбываецца фінансаванне, якія спонсары падтрымалі гэтае рэспубліканскае свята. Без аналізу зробленага нельга казаць пра будучае, як і пра магчымыя фінансавыя падмуркі “Берагіні”. І ці зможа нейкі грамадскі савет вырашыць падобныя пытанні? Вельмі ў гэтым сумняваюся…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Мікола КОЗЕНКА:**

— Згодны з Аленай Уладзіміраўнай: стварэннем грамадскага савета справу не вырашыш. І яшчэ. Напрыклад, той жа Фестываль нацыянальных культур у Гродне прайшоў, а ўжо заўтра арганізатары думаюць пра наступны фэст, які адбудзецца праз год. Тым больш, як вядома, гродзенскі форум падтрымліваюць на ўзроўні Савета Міністраў, аблвыканкамаў ды райвыканкамаў. Для “Берагіні” падобнага сёння, на жаль, і ўявіць нельга: на абласным узроўні пра фестываль могуць і не ведаць…

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Вось і Гродзеншчына сёлета не прымала ў ім удзел. Пэўна, менавіта з-за агучанай праблемы.

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Так. А магло б быць яшчэ горш, бо ні раённыя, ні абласныя адборы для “Берагіні” не праводзяцца. Дзякаваць богу, мяне яшчэ памятаюць у абласных упраўленнях, і дапамагаюць адабраць некалькі калектываў для ўдзелу ў фестывалі. Вось таму і даводзіцца ладзіць чвэрцьфіналы, паўфіналы ды фіналы ў самім Акцябрскім. А калі няма сістэмы ў правядзенні фестывалю, тады і ўзнікаюць розныя праблемы.

**Вера ШЧЭЦЬКА:**

— Мы, да прыкладу, да апошняга часу не ведаем усіх удзельнікаў свята…

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Справа ў тым, што толькі за месяц да пачатку сёлетняга фэсту быў атрыманы загад Міністэрства культуры аб правядзенні “Берагіні”. Таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для ўпраўленняў і раённых аддзелаў праблемным аказалася вызначэнне канкрэтных калектываў для ўдзелу ў рэспубліканскім форуме на Акцябршчыне. Бо ці ж можна за месяц “нарадзіць дзіця”? Ці ж можна за месяц падрыхтаваць калектыў адпаведна канцэпцыі фестывалю, які годна прадставіў бы вобласць ды раён на рэспубліканскім конкурсе? Зразумела, гэтага зрабіць немагчыма. Вось і выкручваемся як можам. Але гэта, пагадзіцеся, таксама праблема!




**Настасся КОМЛІК-ЯМАЦІНА:**

— Вось і ў мяне як у кіраўніка творчай дэлегацыі былі праблемы з падрыхтоўкай да фестывалю: усе чакалі загаду Міністэрства культуры. Але не пра гэта хачу зараз сказаць. Тут шмат ужо гаварылася пра рэкламу, пра стварэнне сайта, пра арганізацыю грамадскага савета. Адразу паўстае шэраг пытанняў. Хто ўсім гэтым будзе займацца? З якіх крыніц аплачваць працу гэтага чалавека? Я не магу зразумець, чаму мы павінны ствараць дадатковыя структуры, калі ў нас ужо існуюць афіцыйныя органы, якія павінны гэтым займацца? Маю на ўвазе тыя ж метадычныя цэнтры, дамы культуры, якія зазвычай і рыхтуюць фестывалі ў рэгіёнах?

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Наша бяда ў тым, што мы прызвычаіліся да старой сістэмы, што існавала яшчэ за савецкім часам, калі загады спускаюцца “зверху”…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Але ж не можа народная творчасць развівацца па загадзе! Таму я і кажу пра стварэнне грамадскага савета, пра неабходнасць удзелу грамадства ў абмеркаванні ўсіх праблем “Берагіні”…

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Людміла Іосіфаўна, усе ведаюць, што ў раёнах тая традыцыя “жыць па загадзе” яшчэ жывая. Вось таму і сядзяць, чакаюць, што скажуць “наверсе”. І без “паперкі” справу тут не зрушыш. Таму і варта гаварыць пра падрымку, пра патранаванне фестывалю з боку Міністэрства культуры.

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Абедзвюма рукамі “за”! Ды мы ніколі не адмаўляліся і не адмаўляемся патранаваць “Берагіню”...

**Ірына КАНАВАЛЬЧЫК:**

— Я больш чым упэўнена ў тым, што калі ў самім Акцябрскім сабраць школьнікаў 9 — 11 класаў і сказаць: давайце распрацуем сайт “Берагіні” — прапанова пройдзе на ўра! А мы чакаем нейкіх папер, загадаў…

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Паўтаруся: мы не можам пазбавіцца ад той сістэмы, у якой існуём. Таму сапраўды трэба падключаць да вырашэння ўсіх фестывальных пытанняў грамадскасць… Але якую?

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Таму я і кажу пра нейкую грамадскую структуру, якая складалася б з людзей неабыякавых, з тых, хто разумее значнасць ды ўнікальнасць “Берагіні”. Не з чыноўнікаў, а менавіта з людзей апантаных, аматараў традыцыйнай культуры. Яны ўжо ёсць, прычым не толькі "бессярэбранікі", але і цалкам заможныя людзі. Ім трэба толькі дапамагчы выявіць сябе.

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Добра, што Людміла Іосіфаўна разбіраецца ў праблемах “Берагіні”, бо яна сама харэограф і раней, працуючы ў Гродне, была звязана з народнай культурай... І яшчэ. Урэшце, калі створана і прынята канцэпцыя наступнага фестывалю з дакладным вызначэннем канкрэтных кірункаў далейшай дзейнасці, дык трэба яе выконваць кожнаму абласному ўпраўленню і мэтадычным цэнтрам. Тады праблем будзе нашмат менш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Тут, мабыць, варта сказаць і вось пра што: чамусьці ў нас прапаганда народнай культуры пастаянна адсоўваецца на другі план. Напрыклад, ва ўстановах адукацыі не хочуць сёння рабіць пастаноўкі народных танцаў, мала займаюцца фальклорам… Калі так пойдзе і далей, дык у хуткім часе аўтэнтычных калектываў, якія займаюцца народнымі танцамі, увогуле можа і не быць.

**Ірына КАНАВАЛЬЧЫК:**

— Калі я сядзела ў журы на адным з аглядаў, дык убачыла, што з трыццаці ансамбляў толькі два працавалі ў жанры народна-сцэнічнай харэаграфіі. Як бачыце, кола звужаецца…

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Кола сапраўды звужаецца. Але не таму, што фестываль нецікавы, а таму, што адыходзіць традыцыя. Такім чынам, "Берагіня" толькі фіксуе тое, што ўжо даўно адбываецца ў Беларусі: знікаюць носьбіты аўтэнтычнай народнай культуры…

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Згодзен. Фестываль — толькі частка праблемы нацыянальнай. Таму трэба глядзець крыху шырэй. Чаму сёння ў школах не вучаць танцаваць? Да прыкладу, былі ў нас этнашколы, а цяпер іх ліквідавалі. А ўсе праблемы ідуць менавіта адтуль. І яшчэ. Тут ужо шмат казалі пра відовішчнасць "Берагіні". Мяркую, не варта рабіць з фестывалю шоу. Бо гэта сапраўдная школа этнавыхавання, у якой ёсць пэўная сістэма.

**Ірына КАНАВАЛЬЧЫК:**

— Але ж без відовішчнасці на фестываль не будуць прыязджаць турысты. І што ж тады атрымаецца? Фестываль дзеля фестывалю. Я лічу, што калі на "Берагіні" будзе прысутнічаць шмат гасцей, турыстаў — толькі тады яна будзе жыць. І, магчыма, многія праблемы фэсту, якія мы цяпер абмяркоўваем, вырашацца лёгка.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Згодзен з вамі. Без прыцягнення моладзі, турыстаў "Берагіня" будзе нагадваць нейкую імпрэзу "для сваіх"…

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Паўтаруся: сёння дзеці, на жаль, не далучаны да пашаны народных традыцый, іх ніхто не вучыць беларускім народным танцам, спевам і гэтак далей. Вось адсюль і праблема. Няма прапаганды нацыянальнага, адсутнічае комплекснае выхаванне ў рэчышчы народных традыцый. Таму спецыялістам з абласцей вельмі цяжка знайсці і падрыхтаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некалькі калектываў для ўдзелу ў той жа “Берагіні”.

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Праблема, агучаная Міколам Козенкам, на мой погляд, яшчэ раз пацвярджае той факт, што мы, беларусы, самі пачалі забывацца на традыцыйную культуру. Мы (большасць з нас) не думаем па-беларуску, не размаўляем на роднай мове, не ведаем народных песень, не кажучы пра танцы…

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— А адсюль і ўсе беды, з якімі сутыкаецца “Берагіня”…

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Так. “Берагіня” спрабуе хоць неяк спыніць названыя працэсы, але самастойна яна гэтага зрабіць не ў стане. Таму, калі не працаваць над вырашэннем вось гэтай, агульнанацыянальнай праблемы, дык усё тое, пра што мы сёння спрачаліся, увогуле не мае сэнсу. Напрыклад, я ведаю, што Вячаслаў Калацэй спрабаваў калісьці ладзіць этнавечарыны, але яны не прыжыліся, не знайшлі свайго гледача, слухача, удзельніка. Дый увогуле, як неаднаразова пісала “Культура”, дыскатэкі сёння страчваюць папулярнасць, асабліва — у сельскай мясцовасці.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— Сутыкаўся з агучанай вамі сітуацыяй неаднойчы. Таму і варта знаходзіць нейкія новыя падыходы, калі мы хочам прывабіць моладзь на падобныя этнаімпрэзы і этнафестывалі.

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Магчыма, трэба падумаць пра тое, каб аб’яднаць фалькларыстаў, стварыць нейкую фальклорную асацыяцыю, і вось гэтымі сіламі ладзіць падобныя імпрэзы ды фестывалі. А міністэрствы культуры ды адукацыі маглі б аказваць дапамогу гэтым людзям, зацікаўленым у папулярызацыі народных традыцый. Таксама не апошняя роля ў гэтым і кафедры харэаграфіі ў БДУКіМ.

**Мікола КОЗЕНКА:**

— Пакуль у нас не будзе створана, прынята парламентам і зацверджана Урадам Нацыянальная праграма “Традыцыйная культура і моладзь Беларусі”, дык, колькі б мы тут ні гаварылі, усё будзе дарма. Пачынаць папулярызацыю традыцыйнай культуры трэба з дзяцінства.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:**

— І якое ж тады рэзюмэ нашай сённяшняй гутаркі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Рэзюмэ наступнае: “Берагіня” зараз знаходзіцца на тым узроўні, калі нікім не аспрэчваецца ўнікальнасць і значнасць фестывалю. Гэта фэст для фарміравання, выхавання ды папулярызацыі нацыянальных традыцый. І варта стварыць пэўную грамадскую асацыяцыю ці савет, што будзе займацца пытаннямі арганізацыі і правядзення “Берагіні”. Толькі колам зацікаўленых людзей мы зможам вырашыць усе пытанні, якія прагучалі пад час сённяшняга “круглага стала”.

**Алена РЫБЧЫНСКАЯ:**

— Мне падаецца, агучаная сёння тэма фестывальнага руху, падтрымкі традыцыйнай культуры праз “Берагіню” — у кампетэнцыі калегіі Міністэрства культуры краіны. Мы ж можам толькі агучыць свае прапановы. А галоўныя пытанні да Міністэрства наступныя: што рабіць з тымі выспачкамі нацыянальных традыцый (у тым ліку — і “Берагіняй”), якія яшчэ захаваліся ў Беларусі? Пад чыім патранажам яны, гэтыя выспачкі, павінны захоўвацца і прапагандавацца? Ці будзе ім аказвацца падтрымка? Вось, мабыць, самае галоўнае.

**Людміла ЛЕБЕДЗЬ:**

— Падтрымка фэсту з боку Міністэрства культуры абавязкова будзе працягвацца і надалей. Бо мы разумеем, што “Берагіня” — знакавы фестываль, які не мае аналагаў не толькі ў Беларусі, але і ў замежжы. Таму яго немагчыма ўявіць без сістэмнага навукова-метадычнага забеспячэння ды падтрымкі на дзяржаўным узроўні…

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

Аўтар: Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ
аглядальнік газеты "Культура"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ